воспитания. К сожалению, многие семьи не знают традиций и соответственно не могут привить любовь своим потомкам к национальному богатству, которое заключается в культуре. И.В. Бестужев-Лада отмечал, что семейное воспитание является для ребенка своего рода «домашней академией». Семья должна представлять собой крепкий фундамент, основанный на связи поколений, памяти о предках и трансмиссии бесценного опыта. Благодаря такому фундаменту дети в будущем смогут построить новую ячейку общества, основанную на духовно-нравственных ценностях.

Таким образом, семья и семейные ценности являются порождением культуры, а ценности должны формироваться не только в домашней среде, но и при проведении совместного досуга.

1. Акимова, Л.А., Социология досуга: учеб. пособ. / Л.А. Акимова. – М.: МГУКИ, 2000. – С. 48.

2. Киселёва, Т.Г. Основы социально-культурной деятельности: учеб. пособ. / Т.Г. Киселёва, Ю.Д. Красильников. – М. : Изд-во МГУК, 1995. – 136 с.

3. Стрельцов, Ю.А. Культурология досуга: учеб. пособ. / Ю.А. Стрельцов. – М.: МГУКИ, 2003. – С. 275.

## МЕТОДЫКА ДАСЛЕДАВАННЯ ПАТРЫЯТЫЧНЫХ ПРАЯВАЎ НАВУЧЭНЦАЎ

**Шык К. І.**
*магістр педагагічных навук, аспірант кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці, выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят*
*УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

У тэксце дадзенага артыкула гаворка будзе ісці не пра вызначэнне ўзроўня альбо сфарміраванасці патрыятызму, ці пэўных яго якасцяў і каштоўнасцяў, а менавіта пра ступень яго праяваў у навучэнцаў, так як патрыятызм як пачуццё фактычна не паддаецца вымярэнню, а пра яго адсутнасць, ці прысутнасць можна судзіць толькі па змястоўным насычэнні асобы: ведаў пра Радзіму, дзе ён жыве, справы, якія ён робіць, эмацыйныя фарбы, якія выстаўляе напаказ. З гэтых пунктаў можна зрабіць толькі першаснае ўяўленне аб асобе, сапраўдны патрыятызм праяўляецца скрозь усе ўчынкі, дзеянні, паводзіны на працягу ўсяго жыцця і носіць інтымны характар. Варта ўлічваць і той фактар, што дадзеная ўзроставая катэгорыя імкнецца да сацыяльна-адабральных выказванняў, што таксама накладае пэўны адбітак на атрыманыя данныя.

Даследаванне ступеняў праявы патрыятызму дае поле для дзейнасці па патрыятычным выхаванні моладзі, бо калі педагог ведае пэўныя пытанні сваіх вучняў, толькі тады ён можа паспрабаваць іх вырашыць у выніку планамернай выхаваўчай работы і асабістага вольнага выбару навучэнца. Трэба звярнуць увагу і на той факт, што патрыятызм мае шэраг адценняў і тыпаў. Для лепшага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разумення і дыягностыкі ступені патрыятычных праяваў былі вылучаны наступныя тыпы патрыятызму:

1. Культурны патрыятызм – носьбітамі даннага тыпу ў сваёй большасці з'яўляецца інтэлегенцыя: паэты і пісьменнікі, навукоўцы, настаўнікі і інш. Гэта тыя людзі якія ведаюць мову, гісторыю і традыцыі роднага краю, папулярызуюць і захоўваюць нацыянальныя каштоўнасці, змагаюцца за духоўнае адраджэнне нацыі.

2. Палітычны патрыятызм – ставіць на першым месцы стварэнне і захаванне незалежнай дзяржавы і праяўляецца праз палітычную дзейнасць.

3. Рэлігійны патрыятызм – гэта апраўданне існавання нацыі праз рэлігію, якая тлумачыць, што дзяржава дадзена Богам і таму сцвярджаеецца, напрыклад, хрысціянствам.

4. Прыродны патрыятызм – носьбіты даннай ідэі любяць прыроду сваёй Радзімы, папулярызуюць беражлівае стаўленне да яе, займаюцца захаваннем унікальных відаў раслін і жывёл у той краіне, у якой яны жывуць, змагаюцца з забруджваннем наваколля і інш.

5. Нацыянальны патрыятызм (нацыяналізм) – гэта вельмі змястоўны тып, які уключае ў сябе і палітычныя каштоўнасці, і культуру, і іншыя праявы патрыятызму, якія былі вышэй апісаны. Адрозенне яго ў тым, што носьбіты даннай ідэі ставяць нацыю вышэй за сям'ю, а інтарэсы нацыі вышэй за свае ўласныя. Часта нацыяналізм выступае як замена рэлігіі. Нацыяналісты могуць выступаць за вяршынства сваёй нацыі над іншай, што завецца «крайнім, альбо негатыўным нацыяналізмам».

6. Агульны патрыятызм, як вышэйшая форма праявы папярэдніх відаў – згодна з дадзеным намі азначэннем, – гэта духоўна-маральная і неабходная каштоўнасць асобы, інтэгральнае пачуццё, якое выяўляецца ў актыўнай жыццёвай пазіцыі, у адказным дачыненні да сябе, свайго здароўя, да сваёй сям'і, сваёй працы. Патрыятызм спалучае ў сабе павагу да мовы, культуры, традыцый свайго народа, усебаковую дзейнасць на карысць Айчыны, самаахвяраванне, уменне ставіць інтарэсы Бацькаўшчыны, вышэй за свае ўласныя і, як следства, вызначае стаўленне да Радзімы ў цэлым.

Ступені праяваў агульнага патрыятызму, мы падзялілі на чатыры групы: аптымальная, сярэдняя, крытычная і недапушчальная. Варта адзначыць, што гэты падзел даволі ўмоўны, бо навучэнцы, якія згодна даследавання будуць падыходзяць да той ці іншай ступені, насамрэч могуць ёй не адпавядаць. Так як высокія веды па гісторыі і культуры Бацькаўшчыны, удзел у грамадска-карысных справах, працавітасць і іншыя якасці не заўсёды сведчаць аб патрыятызме, так як і пры іх адстутнасці нельга казаць пра непатрыятызм асобы. Трэба заўсёды ўлічваць пэўныя асабістыя каштоўнасці, якія праяўляюцца цягам часу і пры пэўных абставінах. Так, у гады Вялікай Айчыннай вайны большасць маладых людзей праявіла сябе сапраўднымі патрыётамі, пры тым, што яны не ўсе валодалі гістарычнымі і культурнымі ведамі, проста працавалі на сваёй зямлі і сталі на яе абарону. Былі і тыя, хто лічыўся патрыётам, а ў выніку перайшоў на бок ворага.

Да першай групы, з аптымальнай ступенню праяваў патрыятызму, можна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аднесці тых, хто ведае пра гістарычнае мінулае свайго і іншых народаў, ведае нацыянальныя звычаі, традыцыі, валодае беларускай мовай, прымае актыўны ўдзел у грамадска-карыснай дзейнасці, характарызуецца высокім пачуццём чалавечага гонару, сумленнасці, мужнасці, працавітасці.

Да другой групы, з сярэдняй ступенню праяваў патрыятызму, умоўна можна аднесці тых, хто не зусім ведае і таму не да канца ганарыцца сваёй культурай і гісторыяй, мала ведае беларускую мову, аднак жадае палепшыць свае веды ў гэтых накірунках, прымае ўдзел у грамадска-карысных справах, але не заўсёды па сваёй волі, а па даручэнні педагогаў і таму не заўсёды праяўляе адказнасць за даручаную справу.

Трэцюю групу, з крытычнай праявай патрыятызму, складаюць тыя навучэнцы, якія амаль не праяўляюць інтарэс да гісторыі і культуры свайго народа, разумеюць беларускую мову, але не хочуць яе ўдасканальваць, дэманструюць абыякавасць да нацыянальных праблем. Дадзеныя маладыя людзі фактычна не прымаюць удзел у грамадска-карысных справах.

Чацьвёртую групу, з недапушчальнай ступенню праяваў патрыятызму, складаюць навучэнцы, якія не праяўляюць ніякага інтарэсу да гісторыі і культуры свайго народа, не хочуць разумець і вывучаць беларускую мову, абыякавыя да нацыянальных праблем, не прымаюць удзел у грамадска-карысных справах, у іх адсутнічае пачуццё нацыянальнага гонару.

Для вырашэння пастаўленых задач па выяўленні ступені патрыятачных праяваў навучэнцаў, варта вызначыць метады ў адпаведнасці з крытэрыямі неабходнасці і дастатковасці. Склад метадаў можна ўмоўна падзяліць на тры групы: тэарэтычныя, эмпірычныя, метады статыстычнай апрацоўкі. У склад групы тэарэтычных метадаў могуць увайсці: бібліяграфічны пошук, вывучэнне і сістэмны аналіз філасофскай, псіхолага-педагагічнай, навукова-метадычнай літаратуры, матэрыялаў навукова-практычных канферэнцый і Інтэрнэт-рэсурсаў па вывучаемай праблеме даследавання; аналіз вучэбна-метадычнай дакументацыі (дзяржаўных адукацыйных стандартаў, нарматыўных дакументаў, планаў, праграм патрыятычнага выхавання моладзі), якія вызначаюць кірунак і тэхналогіі рэалізацыі выхаваўчага працэсу ў пэўных ўмовах; абагульненне вопыту работы, параўнанне, сістэматызацыя, апісанне атрыманых вынікаў, планаванне, метад навуковай рэдукцыі, тэарэтычнага і лагічнага мадэлявання. Групу эмпірычных метадаў складаюць: педагагічнае назіранне, апытанні, анкетаванне, педагагічны эксперымент. У групу метадаў статыстычнай апрацоўкі ўваходзіць апісальная статыстыка, карэляцыйныя і фактарны аналіз вынікаў эксперыменту. Метад апісальнай статыстыкі выкарыстоўваецца для атрымання колькасных характарыстык вынікаў вымярэнняў: сярэдняй арыфметычнай ($\bar{x}$) і яе стандартнай памылкі ($\pm m$), сярэдняга квадратычнага адхілення ($\pm \delta$). З мэтай вызначэння формы і накіраванасці ўзаемасувязяў паміж паказчыкамі ўнутры кампанентаў выкарыстоўваецца метад карэляцыйнага аналізу. Для ўстанаўлення залежнасці змяненняў кампанентаў ступеняў праяваў патрыятызму, (кагнітыўны, эмацыйна-пачуццёвы, дзейсны), ўплыву іх адзін на аднаго варта праводзіць фактарны аналіз.

У ходзе дыягностыкі магчыма выкарыстоўваць: апытанне, анкетаванне, назіранне, методыкі М. Рокіча [2], Л.А. Казінец [1], В.Ф. Пацёмкінай [3] і адаптаванай В.Ц. Чычыкіна [4] і іншыя методыкі, якіх можа патрабаваць даследаванне.

Падчас дыягностыкі вывучаюцца: ўзровень ведаў навучэнцаў (кагнітыўны кампанент), каштоўнасныя арынціры, матывацыі (эмацыйна-пачуццёвы кампанент) і дзейсны кампанент. Пры выяўленні гэтых кампанентаў разлічваецца інтэгральны паказчык (ІП), які дазваляе даць характарыстыку патрыятычнай праяве вышэй адзначаных ступеняў. Вынікі, мэтазгодна прадставіць графічна.

У дадзеным артыкуле асаблівая увага, будзе звернута на раскрыццё зместу адаптаванай часткі методыкі В.Ц. Чычыкіна, іншыя методыкі можна з лёгкасцю знайсці ў інтэрнэце.

Адаптаваная частка методыкі В.Ц. Чычыкіна, дазваляе даць характарыстыку ведаў навучэнцаў па гісторыі і культуры Беларусі ва ўмовах традыцыйнага навучальнага працэсу. Для ацэньвання кагнітыўнага кампанента навучэнцаў трэба распрацаваць спецыяльную апытанку. Змест пытанняў для кантролю ведаў, павінен будавацца на аснове тэарэтычнага зместу праграм навучальных дысцыплін: гісторыі Беларусі, беларускай мовы і літаратуры, асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы. Фармулёўка пытанняў ажыццяўляецца з улікам іх інфармацыйнай ёмістасці, якая вызначалецца экспертным спосабам на аснове выяўлення іх дыягнастычнай каштоўнасці і цяжкасці. Апытанка ўключае 20 пытанняў (па пяць пытанняў для кожнага раздзела: геаграфія, гісторыя, культура, спорт). Кожны правільны адказ ацэньваецца ў 1 бал. Колькасць правільных адказаў вызначае ацэначны бал па кожнаму раздзелу. Гэта дазваляе ў далейшым вылічыць інтэгральны паказчык ведаў (ІПВ) па формуле: ІПВ = (ЕРк Хк) / 4 Е – $\Sigma$, $Р_К$ – каэфіцыенты важкасці значэнняў паказчыкаў тэставання па раздзелах, Хк – колькасць правільных адказаў па раздзелах. Каэфіцыенты важкасці атрыманы для кожнага раздзелу разліковым шляхам [К. Дзенек, В.Ц. Чычыкін]. У табліцы прадстаўлены значэнні каэфіцыентаў для кожнага раздзела ў залежнасці ад колькасці правільных адказаў на пытанні ў межах гэтых раздзелаў. Напрыклад, у раздзеле геаграфія (1) зафіксаваны тры правільных адказа. Па табліцы знаходзім каэфіцыент важкасці, роўны 0,9. Памнажаем 3 на 0,9 і атрымліваем ацэнку, роўную 2,7 бала. Падобным чынам вылічаюцца адзнакі за адказы па астатніх раздзелах.

***Кафіцыенты важкасці па раздзелах***

| Колькасць правільных адказаў | Раздзелы | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 |
| адзін | 0,3 | 0.44 | 0,66 | 1,0 |
| два | 0,6 | 0,88 | 1,32 | 2,0 |
| тры | 0,9 | 1,32 | 1,98 | 3,0 |
| чатыры | 1,2 | 1,76 | 2,64 | 4,0 |
| пяць | 1,5 | 2,2 | 3,3 | 5,0 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У вызначэнні станоўчага адказу на асобныя пытанні, трэба зыходзіць з магчымасці функцыянавання сістэмы на ўзроўні 50% неадпаведнасці эталону, які характарызуе паказчыкі (ідэнтыфікатары). У якасці дадзеных паказчыкаў вызначаюцца сэнсавыя элементы зместу адказу. Калі ў адказе рэспандэнта прысутнічае палова і больш сэнсавых элементаў ідэнтыфікатара, то адказ залічваецца [В.Ц. Чычыкін]. Напрыклад, на пытанне "Дзе цэнтр Еўропы?" Правільны адказ павінен быць такім: Возера Шо, Глыбоцкі раён, Віцебскай вобласці. Аднак, калі адказ горад Полацк, то ён таксама залічваецца, так як менавіта ў ім стаіць памятны знак, які сведчыць аб геаграфічным цэнтры, што знаходзіцца ў 43 км ад гэтага горада.

Такім чынам, нягледзячы на вялікія магчымасці дадзенай і іншых методык па выяўленні ступеняў патрыятычных праяваў навучэнцаў, нельга казаць аб іх дасканаласці, пра што было напісана ў пачатку. Любыя вынікі ў гэтым накірунку з'яўляюцца паверхнаснымі і патрэбны толькі для планамернай работы з моладдзю, каб лепш ведаць іх магчымасці і патанцыял. Аснову дыягностыкі павінны складаць не балы і рэйтынгі, а разважанні, аналіз і высновы работы з навучэнцамі.

1. Казінец, Л.А. Методыка выяўлення і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў : метад. дапам. / Л.А. Казінец. – Мінск : БДПУ, 1998. – 34 с.

2. Сидоренко, Е.В. Методы математической обработки в психологии / Е.В. Сидоренко. – СПб. : Речь, 2002. – 350 с.

3. Райгородский, Д.Я. Практическая психодиагностика. Методики и тесты: учеб. пособ. / Д.Я. Райгородский. – Бахрах-М, 2006. – 480 с.

4. Чичикин, В.Т. Теоретические основы формирования профессиональной готовности специалиста в системе физкультурно-педагогического образования : автореф. дис… д-ра пед. наук : 13.00.04 / В.Т. Чичикин. – М., 1995. – 33 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ